В ходе опроса обучающимся задавался вопрос о последствиях отклоняющегося поведения. Было выявлено, что многие подростки (40%) не представляют, к чему конкретно могут привести проявления отклоняющегося поведения, их ответ звучал как «ни к чему хорошему», «к чему-то плохому». 22% школьников указывают на наказание в виде лишение свободы, тюрьмы, колонии. 8% респондентов предполагают, что девиации могут послужить причинами летального исхода человека. Следует отметить, что только 2,3% опрошенных подростков указали на проблемы со здоровьем, на отвержение со стороны общества, аморальность и деградацию личности.

Поскольку тема профилактики отклоняющегося поведения актуальна, в ходе опроса мы пытались рассмотреть ее более детально. С этой целью педагогам был задан вопрос: «Какие меры профилактики и коррекции девиантного поведения детей и подростков вы используете чаще всего в своей работе?». Полученные материалы показывают, что педагоги включают детей в интересную, социально-полезную деятельность (62%), проводят индивидуальные беседы с родителями трудных детей (58%), рассматривают проблему отклоняющегося поведения на классных часах, (50%), осуществляют индивидуальную работу с трудными детьми (45%), проводят родительские собрания, посвященных проблеме девиантного поведения (43%). Отметим, что 27% респондентов прибегают к использованию возможностей социальных сетей. И только 5% педагогов разрабатывают индивидуальные программы развития и воспитания обучающихся (13%).

**Заключение.** Проведенное эмпирическое исследование подтвердило предположение автора о том, что у подростков качественно другое видение форм и причин подростковой девиантности, нежели чем у педагогов. Полученные результаты побуждают к размышлению о необходимости разработки и реализации новых направлений, форм, общих воспитательных, дифференцированных и личностно-ориентированных стратегий профилактики девиантного поведения несовершеннолетних.

**Список использованной литературы:**

1 Змановская, Е. В. Девиантология: (Психология отклоняющегося поведения): учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / Е.В. Змановская – М.: Издательский центр «Академия», 2003. – 288 с.

2 Клейберг, Ю.А. Психология девиантного поведения: учебное пособие для вузов / Ю.А. Клейберг. – М.: Просвещение, 2003. – 154 с.

3 Кон, И. С. Открытие «Я» / И.С. Кон. – М : Политиздат, 1978. – 367 с.

УДК 327.7

# КАМУНІКАЦЫЙНАЯ ДЭСТАБІЛІЗАЦЫЯ ЯК ПРАЯВА НОВЫХ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭАЛІЙ

**С.В. Венідзіктаў**

*Магілёў, Магілёўскі інстытут Міністэрства ўнутраных спраў*

(e-mail: venidiktov@institutemvd.by)

**Анатацыя.** У артыкуле асэнсаваны наступствы актуальнай трансфармацыі глабальнай інфармацыйнай (медыйнай) прасторы. Прааналізаваны прычыны камунікацыйнай дэстабілізацыі: несупадзенне палітычных і інфармацыйных межаў, камунікацыйны разрыў грамадства і дзяржавы, змяненне ролі аб'екта традыцыйнай палітыкі і тыпу спажывання інфармацыйнага прадукту. Умовай забеспячэння інфармацыйнай бяспекі названа фарміраванне «інфармацыйнага імунітэту» аўдыторыі СМІ.

**Ключавыя словы:** камунікацыя, інфармацыя, СМІ, Інтэрнэт, дэстабілізацыя, фальсіфікацыя, медыяадукацыя.



Репозиторий ВГУ

**S.V. Venidiktov**

COMMUNICATION DESTABILIZATION
AS A MANIFESTATION OF NEW INFORMATION REALITIES

*Mogilev, Mogilev Institute of the Ministry of Internal Affairs*

**Summary.** The article discusses the consequences of the current transformation of the global information (media) space. The causes of communication destabilization are analyzed: the discrepancy between political and information boundaries, the communication gap between society and state, a change in the object's role of traditional politics, and in the type of consumption of an information product. The formation of «information immunity» of media audience is called a condition for ensuring information security.

**Keywords:** communication, information, mass media, Internet, destabilization, falsification, media education.

**Уводзіны.** Падобна да таго, як другая палова XX ст. адзначылася досыць балючым перадзелам сусветнага палітычнага ландшафту, змяненнем сістэмы эканамічных зносін, фарміраваннем сучаснага тыпу грамадства спажывання, першая чвэрць XXI ст., безумоўна, увойдзе ў гісторыю як эпоха перадзелу прасторы камунікацыйнай, канчатковага сцвярджэння новай ролі асобы ў інфармацыйным грамадстве, што вядзе да развіцця сістэмнай напружанасці. Трансфармацыя глабальнай інфармацыйнай (медыйнай) прасторы і перадзел сфер уплыву павялічваюць рызыку канфліктаў і ўзнікнення крызісных сітуацый як на міждзяржаўным узроўні, у межах нацыянальных дзяржаў, так і на ўзроўні індывідуальнага спажывання інфармацыі.

**Матэрыялы і метады даследавання.** У артыкуле тэзісна адлюстраваны вынікі аналізу актуальных з'яў у сучаснай інфармацыйнай прасторы, якія вядуць да крызісу камунікацыйнай сферы. З выкарыстаннем метаду сістэмнага аналізу прапанаваны шляхі пераадолення дэструктыўных з'яў на розных узроўнях.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Лічым, што адна з аб'ектыўных прычын камунікацыйнай дэстабілізацыі – несупадзенне палітычных межаў з межамі інфармацыйнымі, выкліканае камунікацыйнай глабалізацыяй. У такой сітуацыі любая, нават палітычна ўстойлівая і эканамічна стабільная дзяржава знаходзіцца ў зоне рызыкі страты інфармацыйнага суверэнітэту, умяшальніцтва ў фарміраванне нацыянальнага парадку дня, укаранення ў грамадска-палітычным дыскурсе сістэмы ілжывых уяўленняў і ўстановак. Падобныя з'явы выявіліся ў Рэспубліцы Беларусь у другой палове 2020 г. і прывялі да ўзнікнення досыць сур'ёзнага ўнутрыпалітычнага крызісу.

Іншая аб'ектыўная прычына, на наш погляд, – камунікацыйны разрыў паміж сучасным грамадствам і дзяржавай, няздольнасць палітычнай сістэмы забяспечыць нацыянальную кансалідацыю ва ўмовах інфармацыйнага плюралізму. Не беручы да ўвагі актуальныя ўяўленні аб гібрыдных войнах і інфармацыйным тэрарызме (гвалтоўным прапагандысцкім уздзеянні на свядомасць, якое пазбаўляе аўдыторыю магчымасці крытычна ацэньваць масавую інфармацыю), адзначым заканамернасць: сфера традыцыйных палітычных адносін, заснаваная на дасягненні лаяльнасці электаральнай большасці, у інфармацыйным полі новага тыпу паўстае надзвычай размытай. Палітычная лаяльнасць, якая звычайна выяўлялася ў здзяйсненні сацыяльна значных дзеянняў у offline-прасторы, цяпер усё больш залежыць ад ацэнак і каментараў у online-асяроддзі, што не мае нацыянальных межаў, існуе аўтаномна ад сістэмы дзяржаўнага рэгулявання. Для Рэспублікі Беларусь відавочнай ілюстрацыяй названай заканамернасці з'яўляецца імклівы рост аўдыторнага ўплыву telegram-каналаў, выцясненне імі з традыцыйнай зоны ўплыву тэлевізійных і друкаваных СМІ, а таксама зарэгістраваных сеткавых выданняў. Вынікам гэтага стала якаснае змяненне тыпу спа-

Рэпазіторый ВДУ

жывання інфармацыйнага прадукту: а) замена аналітыкі лозунгамі; б) страта даверу да складанага для бытавога ўзроўню разумення палітычнага кантэнту; в) скарачэнне часу на спажыванне адзінкавай навіны, як следства – пэўны рэдукцыянізм; г) рост аўдыторнай патрэбы ў бесперапыннай актуалізацыі стужкі навін; д) адмова ад крытычнага ўспрымання на карысць павелічэння спажывання мультымедыйнага кантэнту; е) кліпавасць і фрагментаванасць інфармацыі і такі ж характар яе засваення аўдыторыяй; ж) змена пазіцыі аўдыторыі з «нейтральнага чытача» на «актыўнага гледача».

Трэцяя перадумова крызісу ў інфармацыйнай сферы – беспаваротнае змяненне ролі аб'екта палітыкі – грамадзяніна, які з набыццём статусу «чалавека медыйнага», «чалавека інфармацыйнага» набыў характарыстыкі не толькі камунікацыйнай, але і палітычнай суб'ектнасьці. Грамадзянін мае доступ да інтэрнэт-прасторы, што патэнцыйна дае яму магчымасць уплываць на інфармацыйную павестку дня праз стварэнне паведамленняў, рэагаванне на іх, уключэнне ў абмеркаванне, падтрымку альбо адмаўленне, салідарызацыю альбо пратэст. Даследчыкі сучаснай камунікацыйнай сферы кажуць пра феномен зняцця сацыяльных забаронаў, сацыяльнай «разняволенасці» інтэрнэт-карыстальнікаў, якія валодаюць скажонымі ўяўленнямі пра ўласную ананімнасць і беспакаранасць. Заўважым, што перыяд адноснай ананімнасці ў Сеціве сапраўды існаваў, хоць і вельмі непрацяглы час, а «віртуальная асоба» досыць хутка набыла суб'ектную самадастатковасць, замацаваную у тым ліку на ўзроўні прававой адказнасці.

У цяперашні час парог уваходжання ў лік лідэраў меркаванняў праз Інтэрнэт надзвычай нізкі, мала залежыць ад фінансавых уліванняў, знешняй падтрымкі, прафесійнай кваліфікацыі і іншых традыцыйных фактараў. Прамы кантроль дзяржавы над гэтай сферай немагчымы – рэальным уяўляецца толькі ўзаемадзеянне з ёй, вызначэнне прававых норм і рэгуліраванне ў іх межах, а таксама садзейнічанне павышэнню агульнай медыяінфармацыйнай культуры насельніцтва. Апошні напрамак, на наш погляд, з'яўляецца найбольш перспектыўным, дазваляючы сфарміраваць аўдыторыю, здольную ажыццяўляць інфармацыйную дзейнасць на якасна іншым узроўні, супрацьстаяць дэструктыўнаму ўплыву ў медыяпрасторы. У гэтай сувязі звернем увагу на заканамернасць: так званыя «каляровыя рэвалюцыі», якія ў XXI ст. неаднаразова прыводзілі да кардынальнага змянення сацыяльна-палітычных сістэм, нязменна адбываліся ў дзяржавах з нізкім узроўнем інфармацыйнай культуры насельніцтва.

Як натуральны працэс адзначым таксама тэндэнцыю шматвектарнасці наступстваў эвалюцыі інтэрнэт-апасродкаванай камунікацыі. Можна сцвярджаць, што любыя інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі (напрыклад, накіраваныя на масавае распаўсюджванне паведамленняў, фарміраванне грамадскай думкі, адцягненне ўвагі аўдыторыі, нейтралізацыю непажаданага дыскурсу, мабілізацыю грамадскасці, кансалідацыю аўдыторыі, выражэнне грамадзянскага непадпарадкавання альбо пратэсту і інш.) рана ці позна становяцца часткай палітычных тэхналогій, накіраваных на зацвярджэнне інтарэсаў камунікатара і падрыў устойлівасці апанентаў. Тут важна разумець нейтральны, непалітызаваны па сваёй сутнасці характар базавых тэхналогій масавай камунікацыі: дэструктыўнасць яны набываюць у працэсе рэалізацыі, зыходзячы з мэт камунікатара і зместу палітычнага дыскурсу. Напрыклад, салідарызацыя праз сацыяльныя сеткі можа з'яўляцца інструментам пераадолення гуманітарнага крызісу ва ўмовах пандэміі COVID-19, у іншых умовах – уяўляе пагрозу ўзнікнення масавых беспарадкаў, справакаваных крызісам палітычнай улады.

Умовай для рэцэпцыі дэстабілізуючай інфармацыі, якая не адпавядае крытэрыям аб'ектыўнасці і сацыяльнай значнасці, з'яўляецца фарміраванне ў грамадзян стану незадаволенасці грамадска-палітычнай рэальнасцю. Гэта стварае ўмовы для пошуку альтэрнатыўных меркаванняў, зніжае здольнасць да крытычнага ўспрымання фактаў і меркаванняў і ўстойлівасць да маніпуляцыі свядомасцю, шматразова павялічвае

Репозиторий ВГУ

ўспрымальнасць да негатыўнага ўплыву. Рэсурсы, якія ствараюць для грамадзян магчымасць абмену думкамі, размяшчэння інфармацыі (больш аператыўнага, чым у афіцыйных СМІ) ва ўмовах інфармацыйнага супрацьстаяння ператвараюцца з інструмента фарміравання грамадскага дыскурсу ў інструмент сацыяльнай агрэсіі. Відавочны прыклад – трансфармацыя накіраванасці і задач сеткавых супольнасцей з нейтральных «клубаў па інтарэсах» у палітычна актыўныя пратэстныя рухі, палітызаваныя і агрэсіўна настроеныя [3].

Нават ва ўмовах інфармацыйнага нейтралітэту, адмовы ад адкрытага ці схаванага супрацьстаяння вонкавым ці ўнутраным апанентам дзяржава павінна ствараць сістэму абароны сваёй медыйнай прасторы. На заканадаўчым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь гэтая задача вырашаецца прынятай Канцэпцыяй інфармацыйнай бяспекі (2019 г.). У Канцэпцыі прыводзіцца вызначэнне інфармацыйнай бяспекі: «стан абароненасці збалансаваных інтарэсаў асобы, грамадства і дзяржавы ад знешніх і ўнутраных пагроз у інфармацыйнай сферы» [1]. На арганізацыйна-тэхнічным узроўні бяспека шмат у чым вызначаецца здольнасцю дзяржавы супрацьстаяць мэтанакіраванай інфармацыйнай агрэсіі, якая мае схаваны, неафіцыйны характар. Неабходна адрозніваць два напрамкі інфармацыйнага ўздзеяння: адкрытая актыўнасць у Сеціве, прадстаўленая каналамі на відэахостынгах, групамі ў сацыяльных сетках і мэсанджарах і да т. п., а таксама закрытыя масавыя рэсурсы, якія забяспечваюць камунікацыю маргіналізаваных сацыяльных структур.

Дзейсны метад барацьбы з фальсіфікацыяй інфармацыі ў telegram-каналах і іншых ананімных крыніцах – раскрыццё рэальных сацыяльна-палітычных сіл, якія стаяць за імі, іх інтарэсаў і выгод, г. зн. ліквідацыя фактару ананімнасці. Пры гэтым прынцыпы свабоднага і адкрытага Інтэрнэту не парушаюцца: прастора для дыялогу не блакіруецца, заканадаўчых забарон на выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных рэсурсаў не ўводзіцца. Адзінае натуральнае абмежаванне звязана з неабходнасцю захавання канстытуцыйных норм, заканадаўства ў сферы масавай інфармацыі, актуалізацыі прынцыпаў прававой і сацыяльнай адказнасці за свядомае скажэнне дадзеных альбо маніпуляцыю свядомасцю аўдыторыі, якая мае негатыўныя наступствы на розных узроўнях (індывідуальным, групавым, дзяржаўным). У такіх умовах шматразова ўзрастаюць патрабаванні да кампетэнтнасці і адказнасці аўтарытэтных традыцыйных СМІ (тэлебачання і прэсы), у першую чаргу, дзяржаўных. У выпадку выкарыстання імі сіметрычных прапагандысцкіх тэхналогій, прыёмаў дыскрэдытацыі апанентаў, пагарды інтарэсамі аўдыторыі эфект фальсіфікацыі толькі ўзмацняецца.

**Заключэнне.** Мяркуем, што абавязковай умовай забеспячэння інфармацыйнай бяспекі з'яўляецца фарміраванне «інфармацыйнага імунітэту» грамадзян – індывідуальнай устойлівасці да непажаданага медыйнага ўздзеяння. Гэта магчыма толькі ў выпадку дасягнення значнай часткай грамадства досыць высокага ўзроўню медыяінфармацыйнай (медыйнай) граматнасці [2]. Падобна да таго, як традыцыйная граматнасць ў свой час стала важкім аргументам на карысць дэмакратызацыі, пераадолення маніпуляцыі грамадствам з боку рэлігійных і палітычных сіл, медыйная граматнасць з'яўляецца ўмовай нейтралізацыі інфармацыйнай агрэсіі, немагчымасці ўкаранення ў масавую свядомасць палітычных ідэй і установак, а таксама рэалізацыі незалежных палітычных паводзін і ажыццяўлення грамадзянскага выбару. Фарміраванне медыйнай граматнасці магчыма выключна ў выпадку скаардынаванай дзейнасці дзяржавы, адукацыйнай сістэмы, арганізацый грамадзянскай супольнасці і СМІ, зацікаўленых у новым тыпе інфармацыйных адносін у соцыуме.



Репозиторий ВГУ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1 О Концепции информационной безопасности Респ. Беларусь : Постан. Сов. Безоп. Респ. Беларусь от 18 марта 2019 г. № 1 // Консультант Плюс : Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2020.

2 Венидиктов, С. В. Информационное взаимодействие в интеграционных формированиях : структурно-функциональная характеристика пространства медиакоммуникации: монография / С. В. Венидиктов. – Могилев : Могилев. институт МВД, 2019. – 176 с.

3 Седых, Т. Н. Теория «непрямых боевых действий» и возможности ее применения в современных условиях / Т. Н. Седых // Манускрипт. – 2020. – Т. 13. – Вып. 2. – С. 125–130.

УДК 159.9

## ОТНОШЕНИЯ «ВЗРОСЛЫЙ–РЕБЕНОК» В КОНТЕКСТЕ ВОСПИТАТЕЛЬНО-ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ ПРАКТИК: ПСИХОИСТОРИЧЕСКИЙ ВЗГЛЯД

**С.Г. Доронина**
*Минск, Институт философии НАН Беларуси*
(e-mail: svetadoris@mail.ru)

**Аннотация.** В статье проводится историческая реконструкция и анализ отношений «взрослый-ребенок» в западной культуре, позволившие выявить закон диалектического развития взрослых и детей, психологические различия которых являются основным критерием их дифференциации. С опорой на концепцию психоистории Ллойда Демоза, автор выдвигает гипотезу о существовании связи между атрибутивными представлениями взрослых о детях и формирующимися на их основании воспитательно-образовательными практиками.

**Ключевые слова:** проективная идентификация; стиль воспитания; отношения «взрослый-ребенок»; диалектическое развитие; диалогические взаимоотношения.

**S.G. Doronina**

ADULT-CHILD RELATIONSHIP IN THE COTEX OF EDUCATIONAL AND EDUCATIONAL PRACTICES: A PSYCHHISTORICAL VIEW

*Minsk, Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus*

**Summary.** The author of the article conducts a historical reconstruction of the «adult-child» relationship in Western culture. As a result of a reflexive understanding of the results, firstly, the law of dialectical development of adults and children was revealed, and secondly, the fact of the connection between the psychological differences between a child and an adult, which underlies their differentiation. Based on the concept of psychohistory of Lloyd Demoz, the author puts forward a hypothesis about the existence of a connection between the attributive ideas of adults about children and the styles of upbringing and educational practices that form on their basis.

**Keywords:** projective identification; parenting style; adult-child relationship; dialectical development; dialogical relationships.

Одна из классификаций, описывающая исторические формы отношений «взрослый-ребенок», представлена американским психологом и историком Ллойдом Демозом в его психоисторической концепции [1]. Согласно этой концепции, способы историко-психологической реакции взрослого на ребенка зависят от скорости протекания психогенной эволюции, обусловленной историческим и социально-культурным контекстом.

Репозиторий ВГУ